Пралетарыі усіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

№ 17

ВЕРАСЕНЬ

1935

Першы дзень школьнага жыцц

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях і ў лістаносцаў

ПАД СЦЯГАМ БАРАЦЬБЫ ЗА АДЗІНСТВА РАБОЧАГА КЛАСА

Закрыўся VII сусветны кангрэс Комуністычнага Інтэрнацыянала. Гэты кангрэс—найвялікшая падзея сучаснасці, за якой з неаслабнай увагай і надзеяй сочаць рабочы клас і працоўныя ўсяго свету. Гэты кангрэс—гістарычная веха на шляху працоўнага чалавецтва да сваёй мэты—да нісправяржэння ладу эксплаатацыі і рабства.

Кангрэс прайшоў пад знакам пролетарскага адзінства для барацьбы з фашызмам і пагрозай імперыялістычнай вайны. Ён заклаў асновы для такой шырокай мабілізацыі сіл усіх працоўных на барацьбу з капіталам, якой не было ніколі ў гісторыі барацьбы рабочага класа. Кангрэс вызначыў паварот у тактыцы Комуністычнага Інтэрнацыянала і з'явіўся кангрэсам сапраўды большэвіцкай самакрытыкі і ўмацавання кіраўніцтва Комуністычнага Інтэрнацыянала і яго секцый. Нарэшце кангрэс прадэманстраваў таржэство адзінства паміж пролетарыятам краіны перамогшага соцыялізма—Совецкага Саюза і змагаючымся за сваё вызваленне пролетарыятам капіталістычнага свету.

Гарачыя прывітанні, якімі быў сустрэнут на кангрэсе даклад тав. Мануільскага аб поспехах соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР, дасягнутых пад кіраўніцтвам правадыра народаў таварыша Сталіна, адлюстравалі любоў і сімпатыі, якімі карыстаецца ў рабочых усяго свету краіна Советаў, бацькаўшчына сусветнага пролетарыята.

Перамога соцыялізма на адной шостай частцы свету—у краіне Советаў, паскараючыйся працэс рэволюцыянізавання мас—з аднаго боку, і з другога—наступленне фашызма, рост ваеннай пагрозы, агульны крызіс капіталістычнай сістэмы—вось галоўнейшыя фактары, якія вызначаюць расстаноўку класавых сіл на міжнароднай арэне. У адпаведнасці з гэтым VII кангрэс Комінтэрна намеціў задачы сусветнага рабочага руху, ухапіўшы тое галоўнае звяно ў класавай барацьбе, якое вызначае яе поспех. Гэта звяно—**тактыка адзінага фронта рабочага класа ў антыфашысцкай барацьбе.**

Фашызм, найбольш агідная, азвярэлая дыктатура манапалістычнага капітала, пагражае рабочаму класу, усім працоўным, усяму чалавецтву. У такі момант баявы прызыў сусветнай партыі пролетарыята — Комуністычнага Інтэрнацыянала к згуртаванню антыфашысцкіх радоў, к адзінству рабочага класа разнясецца гучным рэхам па ўсіх кутках зямнога шара. Гэты баявы кліч будзе пачут мільёнамі. Комуністычны Інтэрнацыянал становіцца сапраўдным правадыром народаў, абаронцам дэмакратычных свабод, правазвестнікам і барацьбітом за культуру.

Фашызм—галоўны падпальшчык новай імперыялістычнай вайны, арганізатар і натхніцель вайны супроць бацькаўшчыны ўсіх працоўных—СССР.

Спалучаць барацьбу супроць імперыялістычнай вайны з барацьбой супроць фашызма—наступны асноўны лозунг у новай жыццёвай і гібкай тактыцы, намечанай кангрэсам. Гэтым знамянальна новая тактыка забяспечваючая паскарэнне адыходу рабочага класа ад рэфармізма, пераход яго да рэволюцыйнай класавай барацьбы і перамагання расколу ў рабочым класе.

У сваім дакладзе на кангрэсе рулявы Комуністычнага Інтэрнацыянала, антыфашысцкі трыбун тав. Дзімітраў аблёк у плоць і кроў гэту новую тактыку Комуністычнага Інтэрнацыянала і кожнай яго секцыі. Сакрушальнай крытыцы падвёрг ён сектанцкія памылкі комуністычных партый, схематызм і дактрынерства тых, хто не навучыўся падыходзіць да мас, абараняць іх канкрэтныя буднічныя інтарэсы, вучыць гэтыя масы і вучыцца на іх вопыце.

Комуністычны Інтэрнацыянал зрабіў рашучы крок да заваявання мас соцыял-дэмакратычных, беспартыйных рабочых і ўсё растучых антыфашысцкіх элементаў у горадзе і вёсцы. „Спалучаць **рэволюцыйны гераізм** германскіх, інспанскіх, аўстрыйскіх і другіх комуністаў з сапраўдным **рэволюцыйным рэалізмам** і пакончыць з апошнімі рэшткамі схаластычнай мітусні вакол сур'ёзных палітычных пытанняў"—вось баявы лозунг для ўсіх секцый Комінтэрна, чотка сфармуляваны тав. Дзімітравым.

Узмацніліся і выраслі секцыі Комінтэрна.

Лік членаў сусветнай Комуністычнай партыі з часу VI кангрэса Комінтэрна вырос з 1 676 тысяч да 3.148 тысяч, прычым у капіталістычных краінах, не гледзячы на рэпрэсіі і крывавы тэрор, лік членаў компартый узрос з 445.300 да 758.500. Лік партый, прымыкаючых да Комінтэрна павялічыўся ад 65 тады да 76 партый цяпер. Лік членаў компартый і комуністычных саюзаў моладзі (уключаючы ВКП(б) і ВЛКСМ) дасягнуў к VI кангрэсу 3 835 тысяч, а к VII кангрэсу—6.800 тысяч.

У дакладах, а таксама ў шырокіх спрэчках на кангрэсе дзейнасць асобных компартый падверглася падрабязнейшаму аналізу. І кангрэс зрабіў сур'ёзныя вывады, сказаў сваё важкае слова.

Мы стаім напярэдадні вялікіх класавых баёў і „мы хочам, каб яны (комуністы) магчыма хутчэй навучыліся плаваць у бурных водах класавай барацьбы". Капіталізм не загіне аўтаматычна. І ён не ўступіць дарогу ідучаму ўперад рабочаму класу. Яго трэба сілай спіхнуць у магілу.

Велізарныя задачы стаяць перад Комуністычным Інтэрнацыяналам і яго секцыямі, і ў гэтай сувязі асабліва востра было пастаўлена на кангрэсе пытанне аб кіраўніцтве компартыямі. Пакончыць з сектанцтвам, адначасова змагаючыся з праяўленнем правага апаргунізма, узняць свой тэарэтычны ўзровень, навучыцца канкрэтна кіраваць,—вось задачы, якія павінны вырашыць компартыі для таго, каб узначаліць шматмільённую рэволюцыйную армію, вядучую барацьбу з фашызмам. Для прадстаячых класавых баёў патрэбны загартаваныя комуністычныя кадры, якія акажуцца на вышыні становішча ў адказны момант. VII кангрэс быў кангрэсам мабілізацыі вышэйшай актыўнасці і ініцыятывы ўсіх сіл комуністычных партый і ўсяго Комуністычнага Інтэрнацыянала для заваявання большасці рабочага класа і для падрыхтоўкі яго да баёў за пролетарскую рэволюцыю.

VII кангрэс Комінтэрна прарабіў велізарную работу. Яго рашэнні паслужаць пуцяводнай зоркай у прадстаячых баях рабочага класа, які пад кіраўніцтвам Комуністычнага Інтэрнацыянала змяце з твару зямлі фашызм, капіталізм.

(Перадавы артыкул „Правды").

Инв. № 111

РАШАЮЧЫ ЭТАП БАРАЦЬБЫ ЗА ЎРАДЖАЙ

Менскі, Аршанскі, Слуцкі і рад другіх перадавых раёнаў, сельсоветаў, соўгасаў і калгасаў рапартавалі партыі і ўраду аб выкананні першай запаведзі—здачы хлеба дзяржаве.

У перадавых раёнах вельмі добра была спалучана здача хлеба дзяржаве з усімі сельскагаспадарчымі работамі. Сакрэт перамог перадавых раёнаў заключаецца ва ўменні забяспечыць партыйным кіраўніцтвам кожны ўчастак, ва ўменні канкрэтна і аператыўна дапамагаць калгасу, брыгадзе, звяну ў правільнай арганізацыі працы.

Дрысенскі, Асвейскі, Расонскі, Мехаўскі і другія раёны адстаюць па хлебаздачы і малацьбе толькі таму, што кіраўніцтва гэтых раёнаў недаацаніла значэння хутчэйшага выканання плана здачы хлеба пролетарскай дзяржаве. Кіраўніцтва з габінета, рэзалюцыямі—вось у чым асноўныя прычыны адставання раду раёнаў.

Своечасовае выкананне плана хлебаздачы немысліма без арганізацыі бесперабойнай малацьбы, без поўнага выкарыстання малацільнага парка.

У БССР налічваецца каля паўтара тысяч складаных і поўскладаных і 25 тысяч конных малатарань. Прычыны адставання ў малацьбе, параўнальна з мінулым годам, таяцца ў беспрытульнасці малацьбы, у антымеханізатарскіх тэндэнцыях у паасобных раёнах, у тым, што райкомы партыі, райвыканкомы, зямельныя органы і МТС многіх раёнаў не аддаюць малацьбе патрэбнай увагі.

Больш таго. У Смалявіцкім раёне кіраўніцтва малацьбой даручана былому ўласніку млына Граховічу, які ўзначальвае антымеханізатарскія тэндэнцыі МТС. Чужыя элементы, пастаўленыя ля малатарань, наўмысна сапсавалі яе, і малатарня выбыла са строю.

Такія агіднейшыя факты не адзінкавы. Зусім зразумела, што класавы вораг будзе выкарыстоўваць малейшае прытупленне класавай пільнасці раённых арганізацый для таго, каб пашкодзіць дзяржаве і калгаснікам, парушаючы ўчасткі барацьбы за ўраджай, абмалот і хлебаздачу Тут патрабуецца пільнае партыйнае вока і кантроль.

Апошняе рашэнне ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб цярабленні і першапачатковай апрацоўцы ільну, тэлеграма, пасланая сакратаром ЦК тав. **Валковічам** Сіроцінскаму і Шклоўскаму райкомам партыі, яскрава гавораць, што і на гэтым важнейшым участку мы недапушчальна адстаем у параўнанні з мінулым годам.

Пад кіраўніцтвам партыі выхаваны дзесяткі тысяч высокакваліфікаваных майстраў ільну: трапальшчыц, мяльшчыкаў, сартыроўшчыкаў. Калгасы ўзброены куды лепш, чым летась, машынамі па апрацоўцы ільну. Само па сабе ўзнікае пытанне: у чым прычыны адставання на гэтым адказнейшым участку?

Тут прычыны зноў-такі заключаюцца толькі ў няўменні спалучаць апрацоўку ільну з усім працэсам сельскагаспадарчых работ. У многіх раёнах не звярнулі ніякай увагі на справу своечасовай падрыхтоўкі мяльна-сушыльных пунктаў, ільназаводаў да прыёмкі і першапачатковай апрацоўкі ільну.

Лён—гэта асноўная тэхнічная культура сельскагаспадарчай вытворчасці. Лён—гэта бавоўна для ўсё ўзрастаючага патрабавання працоўных мас. Лён—гэта вялікая крыніца заможнасці калгасаў і калгаснікаў. На барацьбу за высокаякасны лён павінны быць мабілізаваны ўсе калгаснікі і калгасніцы Совецкай Беларусі.

У паход імя таварыша Гікало за лён уключыліся тысячы калгаснікаў, калгасніц. Справа заключаецца ў тым, каб яшчэ больш узняць парыў гэтых энтузіястаў барацьбы за лён, яшчэ вышэй узняць сцяг спаборніцтва за першынства ў паходзе.

Паступіўшыя к нам пісьмы намесніц старшынь па ільну сведчаць, што гэтым новым людзям соцыялістычнай вёскі зусім мала дапамагаюць у рабоце. Многія кіраўнікі сельсоветаў і калгасаў лічаць, што варта толькі вылучыць намесніка па ільну—і справа будзе забяспечана. У многіх раёнах проста забываюць, што поспех будзе забяспечан толькі тады, калі намесніку па ільну будзе аказана сістэматычная дапамога ў яго адказнейшай рабоце, калі раённыя арганізацыі, кіраўнікі калгасаў створаць намесніцам па ільну аўтарытэт і спрыяючыя ўмовы для іх прадукцыйнай работы.

БССР уступіла ў самы адказны перыяд барацьбы за ўраджай 1935 г. і ад таго, наколькі будуць мабілізаваны ўсе партыйныя і совецкія арганізацыі, калгаснікі, працоўныя аднаасобнікі на барацьбу за ўраджай, залежыць поспех завяршэння ўсяго сельскагаспадарчага года.

Сігналы з месц гавораць, што не ўсюды арганізавана пільная ахова ўраджаю. Задача заключаецца ў тым, каб захаваць у дзяржаўных і калгасных свірнах увесь ураджай да аднаго зерня.

Тэмпы абмалоту, хлебаздачы, апрацоўкі і здачы трасты і ільну павінны быць крута ўзняты. Гэта дасць магчымасць хутчэй размеркаваць ураджай, павялічыць вагу працадня калгаснікаў.

Ні на мінуту нельга забываць азімую сяўбу і зяблівае ворыва — асновы рэкорднага ўраджаю 1936 года.

Ордэнаносная БССР мае ўсе магчымасці поўнасцю захаваць увесь ураджай, поўнасцю і ў тэрмін выканаць усе абавязкі перад пролетарскай дзяржавай і гэтым самым зрабіць буйны крок наперад у справе заваявання заможнага і культурнага жыцця для ўсіх калгаснікаў і калгасніц.

УБАРАЦЬБЕ За першае МЕСЦА

Ужо па ўсяму СССР гудзелі трактары ў калгасах і соўгасах, а ў Палессі, у Ельскім раёне ўсё яшчэ аралі на валах.

Ужо па ўсяму Саюзу з'явіліся дзесяткі і сотні маладых дзяўчат—трактарыстак, машыністаў, тэхнікаў, а палеская дзяўчына ўсё яшчэ баялася выйсці за вакольцу. Зараз аб гэтым успамінаюць, як пра непрыемнае мінулае.

У студзені гэтага года ў Ельску былі адчынены курсы трактарыстаў. Сорак лепшых ударнікаў паступілі на гэтыя курсы. Сярод іх пяць маладых дзяўчат.

А ў сакавіку арганізавалася МТС. На тэрыторыі Ельскага раёна з'явілася 22 трактары. Лепшыя ўзоры работы паказалі трактарысткі **Клобук** Вася і **Канопліч** Дуня.

Усё-ж пасеўную правялі мы не вельмі добра. Не дрэнная была якасць сяўбы, але адсталі мы ў тэмпах.

Заняць адно з першых месц па выкананню гаспадарчых работ і па ўзняццю культурнага будаўніцтва Ельскі раён раней ніколі не спадзяваўся. А цяпер па ўборцы мы займаем шостае месца ў Беларусі. Рашаючая роля на ўборцы, як вядома, належыць жанчыне і, трэба прама сказаць, поспехамі па хлебаўборцы мы абавязаны знатным людзям нашага раёна: **Казёл** Варке, **Ладышэнка** Наталлі, **Лапам** Маланні і Ульяне, (калгас «Х з'езд советаў»), **Гуд** Насце, **Яцухно** Ольге, **Карась** Маланні і Алене (калгас «Новая Дуброва»), **Загароўскай** Сцёпе (калгас «Шлях соцыялізма»).

Мы павінны адзначыць, што ўдарна працавала не толькі моладзь. Нават старухі: **Гуд** Алена, **Варабей** Соф'я, **Яцухна** Фёкла і 70-гадовая **Трошка** Мар'я кожны дзень перавыконвалі свае нормы.

Добра была арганізавана работа ў калгасе «Х з'езд советаў». Цэлы дзень работа, а ўвечары ў ярка асветляным электрычнымі лампачкамі калгасным клубе весела наігрываў на калгасным гармоніку машыніст Кароль **Ціхі.**

Ударніцы калгасных палёў наспех скідвалі сваю рабочую вопратку, хутка апраналіся ў рознакаляровыя і прыгожыя плацці і спяшаліся ў клуб, каб у хуткім танцы і вясёлых песнях выліць радасць свайго жыцця.

Заняўшы адно з першых месц па ўборцы, мы змагаліся за тое, каб не здаць і ў хлебаздачы.

Ужо к 20 жніўня многія перадавыя калгасы нашага раёна: «Х з'езд советаў», «Рэволюцыя», імя Варашылава, «Пабеда»—поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па хлебапастаўкам, а к 5 верасню наш раён занесен на чырвоную дошку.

Е. МАЛЯЎСКАЯ.

НОВЫ ПРЫЛІЎ

Уборка ў нашым калгасе ў гэтым годзе прайшла значна лепш, чым у мінулыя гады. Лён, жыта і яравыя культуры мы ўбралі за 8 дзён. Калгасніцы і калгаснікі паказалі ў рабоце па ўборцы вялікую свядомасць. Брыгадзірам не прыходзілася ўспамінаць аб тым, што трэба ісці на работу. Кожны сам да яе рваўся. Нават падросткі і тыя арганізаваліся ў звяно і ўдарна працавалі на полі.

Разам з уборкай у нас праходзіла малацьба і здача збожжа дзяржаве. Аднымі з першых па Менскаму раёну, да 14-га жніўня, мы выканалі поўнасцю гадавы план зернапаставак і разлічыліся за натураплату з МТС.

Трэба адзначыць добрую работу актыва калгаса ў часе ўборкі і малацьбы. Старшыня калгаса **Шутаў,** брыгадзіры **Войцэх** і **Жоглін** і астатні актыў увесь час былі на нагах. Многа дапамог калгасу і старшыня сельсовета тав. **Маслыка.**

Мы актыўна змагаліся за тое, каб не было страт пры ўборцы ўраджая. Добра работалі інспэктары па якасці, добра работала і лёгкая кавалерыя. Я таксама ўваходжу ў склад лёгкай кавалерыі. 10-га жніўня ўначы пры праверцы аховы ўраджая мы выявілі, што вартавыя **Хмялеўскі** Васіль і **Равінскі** Антось не былі на полі. Хмялеўскі быў на вечарынцы, а Равінскі п'янстваваў з рахункаводамі Мацюшом і Шайкоўскім. Да іх праўленне калгаса прыняло адпаведныя меры.

Уборка выклікала новы прыліў у калгас: 11 бедняцка-серадняцкіх аднаасобных гаспадарак уступіла ў калгас.

Хмялеўская Гэля.

Сенніцкі сельсовет, калгас „Х з'езд".

НАШ КАЛГАС—ПЕРАДАВЫ

У 1929 годзе арганізаваўся ў нас калгас «Х з'езд советаў». Раней наша вёска Сізіоны была амаль уся кулацкая і хутары былі абгароджаны як турма высокімі платамі. Туды не толькі чужы чалавек не мог прайсці, нават сабаку не прапускалі.

А цяпер нашу вёску не пазнаць. Жывем мы новым культурным жыццём. У калгасе пабудавалі новы клуб, маецца бібліятэка. Увесь калгас электрафікаваны.

Датэрмінова, першымі ў раёне, выканалі мы план хлебаздачы і атрымалі пераходны чырвоны сцяг.

Фрайман Сіма.

Ельскі раён, Скарадзянскі сельсовет.

ДРУЖБА

Оля **Ермочэнка** прышла сюды з рабочай сям'і. Бацька яе і цяпер працуе чыгуначнікам на станцыі Барысаў. Скончыўшы сямігодку Оля паступіла ў Брагінскі жывёлагадоўчы тэхнікум. Па сканчэнні тэхнікума яе накіравалі ў Чырвонапольскі маслазавод. Доўга тут ёй не давялося працаваць. Яе абралі старшынёй Чараўскага сельсовета. Калгаснікі ведалі Олю па рабоце на маслазаводзе, у комсамоле. Яе шлях—шлях дачкі рабочага, комсамолкі.

Зусім іншай дарогай на пасаду старшыні Гніліцкага сельсовета прышла Ліда **Вержбіцкая**. Яна нарадзілася і выросла ў сям'і бедняка—селяніна.

У часе калектывізацыі Ліда была членам прэзідыума сельсовета. Яе не раз папярэджвалі кулакі, што прыкончаць яе, калі яна будзе іх чапаць. Але Ліда добра ведала, што за яе партыя, улада. Яна сумленна выконвала тое, што гаварыла партыя і вялікі Сталін. Рос аўтарытэт Ліды сярод насельніцтва. У апошнія перавыбары яе абралі старшынёй сельсовета.

Оля і Ліда—суседкі. У часе веснавой сяўбы яны заключылі дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва. Яны пасылалі лепшых калгаснікаў на ўзаемаправерку работы калгасаў.

Оля больш граматная, а Ліда практык, добра ведае сельскую гаспадарку. Вось яны і вучаць адна другую.

Спаткаліся ў пералеску

— Ты куды?—замест прывітання запытала Ліда.

— Да цябе. Адстаю, Лідачка. Аднаасобнікі затрымліваюць хлебаздачу.

Адставала Оля па ўсіх сельска-гаспадарчых работах. Аб гэтым паказвалі лічбы, якія дзяўчаты тут-жа разглядзелі. Па сельсовету, якім кіруе Ліда, зернавыя былі поўнасцю ўбраны, а лёну на 25 жніўня выцерэблена і разаслана 99,2 проц. Па сельсовету Олі было зжата зернавых 92,6 проц., выцерэблена лёну—91,5 проц. Па хлебаздачы Олін сельсовет адставаў на 12 проц. У Ліды было здадзена збожжа дзяржаве 73,4 проц. (па раёну на 20 жніўня было здана ўсяго 26,3 проц.).

Доўга гаварылі дзяўчаты аб тым, якім спосабам выканаць першую запаведзь—разлічыцца з дзяржавай. Дапамагалі адна другой.

На 25 жніўня раён выканаў план збожжапастаўак на 45 проц., а Гніліцкі сельсовет 24 жніўня поўнасцю разлічыўся з дзяржавай. Былі здадзены зернавыя і ільнонасенне. Чараўскі сельсовет 26 жніўня закончыў збожжапастаўкі і поўнасцю здаў ільнонасенне.

Вержбіцкая Ліда.

Дзяўчаты абавязаліся да 5 верасня закончыць сяўбу азімых. Калгасы пачалі сеяць 15 жніўня. Рыхтуюцца к пад'ему лёну, апрацоўцы яго і здачы дзяржаве ільновалакна.

Лепшай ацэнкай работы маладых дзяўчат будуць словы сакратара райкома партыі **Лапаціна:**

— У нашым раёне перадавымі сельсоветамі лічацца тыя, якімі кіруюць **Ермачонак** і **Вержбіцкая**.

Комсамолка Оля і беспартыйная Ліда выконваюць адзіную справу, справу партыі Леніна-Сталіна.

А. Манькоў.

Чырвонапольскі раён.

З ДАПАМОГАЙ АКТЫВА

На ўсебеларускай нарадзе жанчын — старшынь сельсоветаў, я заключыла соцыялістычную ўмову з старшынёю Рудня-Марыманаўскага сельсовета, Лоеўскага раёна таварышам **Атромчэнкай** Ольгай. Я ўзяла на сябе наступныя абавязкі: змагацца за пяршынство ў раёне па выкананню ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній, за культурны сельсовет, за лепшае развіццё жывёлагадоўлі, за наладжванне пажарнай аховы, за добрую падрыхтоўку да новага навучальнага года.

Прыехаўшы з Менска, я растлумачыла ўсе пастановы нарады калгаснікам і аднаасобнікам, расказала аб выступленні сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Гікало.** Асноўны ўпор я ўзяла на масавую работу па лепшаму правядзенню ўборкі ўраджая і выкананню хлебапастаўак.

Цяпер я магу смела заявіць, што ўсе ўзятыя абавязацельствы мною выкананы. Па майму Камарынскаму сельсовету ўборка ўраджая прайшла добра. Убралі ў тэрмін і без страт. На 10 жніўня ўсе калгасы сельсовета поўнасцю разлічыліся з дзяржавай. Па аднаасобнаму сектару план хлебапастаўак на 17 жніўня выканан на 90 проц. Закончылі перабленне ільну і прыступілі да масавага абмалоту і здачы дзяржаве ільнонасення.

У выніку растлумачальнай работы сярод аднаасобнікаў у нас атрымаўся масавы прыліў у калгасы ў часе ўборачнай і збожжапастаўак. Па ўсяму сельсовету засталося толькі 30 аднаасобных гаспадарак. Спадзяюся, што ў канцы 1935 года сельсовет будзе суцэльна калектывізаваны.

Мой сельсовет з'яўляецца сапраўды культурным. Канцэлярыя добра абсталявана. Сцены ўкрашаны партрэтамі правадыроў, на вокнах і сталах расстаўлены кветкі. Памяшканне выбелена, падлога заўсёды чыстая.

Школа добра адрамантавана і з 15 жніўня гатова да новага навучальнага года.

План развіцця жывёлагадоўлі па сельсовету поўнасцю выкананы. Закончана сіласаванне. Цяпер прыступілі да ацяплення хлявоў і падрыхтоўкі іх да зімы. Няма ў нас бескароўных калгаснікаў.

Дзякуючы энергічнай рабоце ўсяго актыва, мой сельсовет зараз занесен на раённую чырвоную дошку.

Федасенка Мар'я.

Камарынскі раён.

ПА НАКАЗУ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Скромнасць, якая ўласціва большэвікам, ёсць у Анэлі **Віні ке.**

Год таму назад абралі яе старшынёй Балашэўскага нацыянальнага польскага сельсовета. Ён быў самым адстаючым ў Рэчыцкім раёне. Сэрца тав. Вініке перапоўнілася трывогай: не спраўлюся, знімуць з работы— сорамна будзе мне і другім жанчынам за мяне.

Некалькі разоў хадзіла да старшыні РВК тав. **Саўкова** і прасіла аб аслабаненні яе з працы. Ён адмовіў у гэтым, але сам штодзённа дапамагаў ёй у рабоце.

Паступова знаёмілася Анэля з працай, згуртавала навакол сябе шырокі калгасны актыў. У разрэзе выканання наказа выбаршчыкаў склала план сваёй работы. З кожным днём усё больш рассейваліся сумненні.

Упарта па-большэвіцку работала яна і хутка вывела свой сельсовет з адстаючых у перадавыя. За выкананне фінплана тав. Вініке атрымала ад ЦВК БССР прэмію ў 300 руб., а за добрую пастаноўку ўсёй работы ЦВК СССР прэміраваў яе сельсовет пяццю тысячамі рублёў. Асабіста тав. Вініке атрымала з Масквы патэфон, паляўнічае ружжо і 150 руб.

Суседні з Балашэўскім сельсоветам—Дзюрдзеўскі, таксама лічыўся ў раёне адстаючым. У пачатку 1935 года ён зліўся з Балашэўскім сельсоветам. Старшынёй засталася тав. Вініке.

Цяпер яна яшчэ больш упэўнена ў сваіх здольнасцях. Як і заўсёды актыў—члены секцый у яе на першым плане. Кожная з іх атрымоўвае ад яе пэўнае заданне па выкананню наказа выбаршчыкаў. Кожны ведае свой участак, які замацован за ім.

Цяпер тав. Вініке заяўляе:

— Скажу не хвалячыся, і ў новым вялікім сельсовеце я разам са сваім актывам дабілася некаторых поспехаў. Поўнасцю выканалі мы наказ аб адрамантаванні дарог. Вёскі Балашэўка, Святое, Аколіца, Дзюрдзева абсаджаны дрэвамі. У Дзюрдзеве пабудован парк. Па сельсовету папраўлена 23 калодзежы. Школы адрамантаваны і забяспечаны на зіму апалам.

Паступова ліквідуюцца цяжкасці ў рабоце і Дзюрдзеўскі сельсовет ідзе зараз першым у раёне. ЦВК СССР узнагародзіў т. **Вініке** ганаровай граматай.

* * *

Светлы і ўтульны пакой. Пяць вялікіх вазонаў. На вокнах кружаўныя фіранкі. Стол накрыты суконным чырвоным абрусам. Гэта канцэлярыя Рамана-Слабодскага сельсовета, Рэчыцкага раёна.

Старшыня сельсовета тав. **Гузенко** так гаворыць аб сваёй рабоце:

— Мой сельсовет культурны не толькі тым, што ён чысты і ўтульны, а тым, што кожны працоўны, прышоўшы ў сельсовет, заўсёды своечасова атрымае здавальняючы адказ. Паданая ў сельсовет заява разбіраецца не пазней як праз два-тры дні, вынікі рашэнняў дасылаюцца асабістым паведамленнем.

— Наш сельсовет не прымушае доўга чакаць адказу. Мы падалі заяву 12 ліпеня, а адказ атрымалі 14-га, — расказваюць **Мацюшонак** Сямён і тав. **Радзько.**

Пры сельсовеце добра работаюць секцыі. Для выканання наказа выбаршчыкаў кожная секцыя склала план сваёй работы.

Асабліва добра працуе культурна-бытавая секцыя. Па сельсовету пабудавана пяць калгасных лазняў, шмат вуліц абсаджана пладовымі і другімі дрэвамі. Насаджана два новых парка. Праз кожныя дзесяць дзён аглядаюцца кватэры калгаснікаў. Кіруе работай секцыі член прэзідыума тав. **Шаўлонская.**

Не дрэнна працуюць і другія секцыі: дарожна-будаўнічая, палявая, жывёлагадоўчая.

Праз кожныя тры месяцы члены сельсовета і кіраўнікі секцый адчытваюцца за праробленую работу на прэзідыуме сельсовета, а таксама перад сваімі выбаршчыкамі. **Ючкова.**



Тав. Гузенка ў сваім габінэце.

ПРЫКЛАД ЖОНКІ

Лепшая ўдарніца брыгады № 2 **Александрова** Варка не толькі сама ўдарна працавала на полі ў часе ўборкі ўраджая, але прымусіла ўдарна працаваць і свайго мужа Ягора.

— Я,—заявіла Варка,—пакуль на работу ісці, павінна печку выпаліць, усім есці наварыць, дзяцей і скаціну дагледзець і на рабоце я не адстаю—штодзенна выпрацоўваю па 2 нормы. А ты слабодны ад хатняй работы і павінен па касьбе выпрацоўваць не менш 1,5—2 нормы.

Ягор у прысутнасці ўсяго звяна даў Варке слова выканаць яе патрабаванне і выканаў.

Караваева.

Мехаўскі раён, калгас „Новы шлях".

ДЗЕ-Ж ДАПАМОГА ВЫЛУЧЭНКАМ?

ПАДРЫВАЮЦЬ РАБОТУ

Я працую старшынёй Крупскага местэчковага совета ўжо 10 месяцаў. Да гэтага часу я на кіруючай рабоце не працавала, а была работніцай. Я баялася ісці на гэту работу, думала што не спраўлюся. Але мне Райком КП(б)Б і РВК абяцалі дапамагаць, і я згадзілася.

На ўсебеларускай нарадзе жанчын—старшынь сельсоветаў тав. **Гікало** нам расказаў, як павінны нам дапамагаць раённыя арганізацыі, асабліва тым, якія не былі на кіруючай рабоце. Мне-ж не дапамагаюць, а наадварот—падрываюць работу.

Ніколі ніхто не зойдзе ў местсовет, не запытае як я працую. На пленуме, ці на прэзідыуме ніколі ніхто не быў. Калі я да якога-небудзь сабатажніка, які не хоча выконваць сваіх абавязкаў перад дзяржавай; прыму меры, старшыня РВК адразу адмяняе і гэтым падрывае мой аўтарытэт.

Раней у нас сярод мястэчка каля клуба быў базар. Я там пасадзіла садзік, а базар адвяла ў другое месца. На абсталяванне гэтага базара сродкаў у местсовеце няма. Прапанавалі мы ўсім кааперацыйным арганізацыям пабудаваць крамы і ларкі і праводзіць гандаль на новым рынку. Яны не выконваюць гэтага рашэння.

Прэзідыум местсовета вынес рашэнне прасіць РВК уздзейнічаць на гэтыя арганізацыі. Але РВК да гэтага часу не заняўся гэтым пытаннем, і калгасны гандаль няма дзе праводзіць.

Працуем мы ў дрэнным памяшканні. Будынку для местсовета няма. За малую халупку плоцім 50 руб., якія ў бюджэт не ўключаны. Калі я папрасіла ў старшыні РВК дазволу заняць пад канцэлярыю местсовета адзін з комунальных дамоў, старшыня адказаў: — «Не смей, працуй дзе хочаш і плаці чым хочаш».

У такіх умовах працаваць далей немагчыма.

Марозава.

НЕ ДАПАМАГАЮЦЬ

У сваёй рабоце — загадчыцы фермы я сустракаю многа цяжкасцей. Праўленне калгаса мала зварачае ўвагі на развіццё жывёлагадоўлі, і няма каму дапамагчы мне.

Скончыла я курсы старшынь сельсоветаў пры Магілеўскай соўпартшколе і маю рэкамендацыю, што магу працаваць старшынёй сельсовета. Мяне абралі намеснікам старшыні Сілічэўскага сельсовета. Але намеснікам я лічуся толькі на паперы. Практычнай работы мне не даручаюць. Нават, калі старшыня сельсовета быў месяц у доме адпачынку, дык мне сваёй работы не даручыў.

Цурыкава Ліза.

Калгас „Новы пахар",
Касцюковіцкага раёна.

ЗНАТНЫ ЧАЛАВЕК

У калгасе пра **Якавіцкую** Варвару гавораць:

— Спрытная жанчына. Любога за пояс заткне.

Нельга інакш пра Варвару казаць. Роўнай няма ёй у рабоце. Аб гэтым ведаюць усе калгаснікі. А старшыня калгаса **Малкін** заўсёды зварачае ўвагу адстаючых на работу Якавіцкай.

Безумоўна ёсць чаму вучыцца ў Варвары. Працуе яна добра. Ніхто з ёй не можа параўнацца. Нібы ў яе серп не такі, як у другіх, а вастрэйшы. Калгас прыняў норму для жнеі — 12 сотак га, а Варвара выжынала жыта 30-33 сотак у дзень.

Паглядзіш на яе і на яе работу і сэрца радуецца:—жанчыне —58 год, а так працуе.

Каштоўны яна чалавек не толькі на вытворчасці, але і ў грамадскім жыцці. На сходы прыходзіць заўсёды першай і прыводзіць з сабой суседак. Дапамагае праўленню праводзіць палітычна-гаспадарчыя кампаніі. Праўленне ведае Варвару, як настойлівую, адданую калгаснай справе жанчыну, і даручае ёй адказную працу.

Не было такіх выпадкаў, каб Варвара адмовілася выканаць даручанае. І выконвае добрасумленна. За гэта праўленне шануе Варвару, шануе яе працу, як лепшай у калгасе актывісткі. Досыць сказаць, што Якавіцкую Варвару за работу ў калгасе восем разоў прэміравалі. Першай па Шацкаму сельсовету яна падпісала ганаровае пісьмо знатных людзей Беларусі тав. **Сталіну.**

— Гэтым пісьмом я абавязала сябе працаваць яшчэ лепш, чым да гэтага часу, — кажа Варвара.

Узятыя абавязацельствы Варвара выконвае з гонарам, бо яна любіць калгас, любіць яго справы.

Бухцілаў.

Смілавіцкі раён.



Якавіцкая Варвара.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ



Да рэволюцыі тут быў адзін з участкаў маёнтка графа Чапскага. Некалькі канюшань, ды пару хатак для парабкаў графа, аздаблялі гэта месца.

А цяпер? Цяпер тут знаходзіцца буйны **свінасоўгас імя Свярдлова.** Цэлы гарадок. Кіпіць ключом культурнае жыццё.

Новы клуб на 300 чалавек — краса і гордасць соўгаса. Усё прадугледжана: асобныя пакоі для гурткоў, бібліятэка, чытальня, дзіцячы пакой.

Па ініцыятыве палітаддзела соўгаса, у гэтым годзе арганізован аднадзённы дом адпачынку для ўдарнікаў і піонерскі лагер.

У былым кулацкім доме, сярод зелені і кветак знаходзяцца гэтыя ўстановы. Увечары, напярэдадні выходнага дня ў дом адпачынку накіроўваюцца лепшыя ўдарнікі. Тут яны бываюць цэлыя суткі, падмацоўваюць сваё здароўе добрымі харчамі і вясёлым правядзеннем часу. Тут і спартыўная пляцоўка, бібліятэчка і патэфон.

***

У піонерскім лагеры — 28 дзяцей рабочых соўгаса. Дзеці паправіліся. Загарэлыя бегаюць яны, весела катаюцца на кольцах, іграюць у валейбол. Кормяць дзяцей у лагеры пяць разоў у дзень.

Абед. Барабанны бой. Усе дзеці становяцца ў адну шарэнгу і арганізавана ўваходзяць у сталоўку. З апетытам ядзяць смачны халаднік, пшанічныя аладкі з салам і вішнёвы кісель.

На наша запытанне — ці досыць харчоў, дзеці адказалі:

— Не паядаем, што даюць нам!

Піонеры развучваюць розныя спевы, пляскі, кітайскі танец і фізкультурныя выступленні.

***

У соўгасе ёсць яслі на ўсіх трох участках. У яслях на трэцім участку, побач з піонерскім лагерам знаходзяцца 13 дзяцей рабочых. Усе яны здаровыя, бадзёрыя, загарэлыя.

У спальні выключная чысціня, пыліначкі не знойдзеш. Ручнікі бялюсенькія. Перад ядой дзеці заўсёды мыюць ручкі.

Дзетвара абедала. Смачны суп з мясам, каша і кісель.

Пасля абеду — адпачынак.



Маткі задаволены яслямі. Яны адзываюцца аб іх, як аб культурным ачагу.

Е. Эпштэйн.

Дзяржынскі раён

НА ДЗІЦЯЧАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ

У гэтым годзе калгас «Свабода», Сіроцінскага раёна накіраваў на раённыя курсы дашкольніц калгасніцу Дуню **Баранаву.**

На курсах яна добра вучылася і пасля сканчэння іх засталася работаць загадчыцай дзіцячай пляцоўкі калгаса.

Калгасніцы задаволены работай Баранавай і гэта зразумела.

Баранава прывучыла дзяцей к дысцыпліне і прывівае ім працоўныя навыкі. Кожны дзень дзеці па чарзе дзяжураць у часе яды, глядзяць за парадкам. Старшых дзяцей ужо падрыхтоўваюць да школы.

Калі мы запыталіся ў семігадовага Лёні **Шатунова** чым ён займаецца на пляцоўцы, ён адказаў:

— Я рыхтуюся стаць вучнем школы.

А **Гусакова** Люда так звыклася з пляцоўкай, што нават дамоў ісці не хоча.

Дзеці добра паправіліся. У гэтым не малая заслуга кухаркі і прыбіральшчыцы — калгасніцы **Смальковай** Дуні. Харчаванне смачнае і добрае. На пляцоўцы заўсёды чыста і ўтульна.

Альтшулер.

Сіроцінскі раён.

РАДАСЦЬ Мар'і

Памятае Мар'я апошнія словы свайго мужа Фёдара:

— Ну, Мар'я, іду ваяваць з белапалякамі, каб потым нам ды дзецям нашым жыць было добра. Не сумуй, Мар'я, хутка вярнуся. Бывай...

Засталася Мар'я з невялічкай дочкай Таняй ды трохгадовым Пецькам. Цяжка жылося. Малыя дзеці не давалі магчымасці нарыхтаваць на зіму хлеба, ледзь-ледзь перабіваліся з вады на хлеб. Не пакідала Мар'ю жаданне, каб хутчэй скончылася вайна і прышоў Фёдар. Неяк раз у святочны вечар, каб разагнаць свой сум і гора, Мар'я вышла пагуляць на вёску. Там даведалася, што прышлі з фронту **Шаўцоў** Осіп і **Саплёў** Цішка і ў Мар'і трывога пранікла ў сэрца.

Чаму-ж няма майго Фёдара? Мабыць забілі, — думала Мар'я. Усю ноч хвалявалася, толькі над свет прыдрамнула крыху.

Праходзілі дні. Усе папрыходзілі з фронту, прышоў нават **Глушакоў** Васіль, якога доўга трымалі белапалякі ў палоне. Не прыходзіў толькі Фёдар, і Мар'я пераканалася, што ён загінуў.

***

Ішлі гады. Мар'я атрымоўвала пенсію за Фёдара, дзеці падраслі, але ўсё яшчэ адчувалася адсутнасць гаспадарскіх рук. І толькі ў 1929 годзе, калі Мар'я першай запісалася ў калгас імя Комінтэрна, яна пачала жыць весела і радасна. У 1930 годзе збудавала ўласную хату і перайшла туды жыць.

Культурна жыве цяпер Мар'я. У хаце ў яе чыста, на вокнах фіранкі. Аб хлебе Мар'і не прыходзіцца думаць, бо яна лепшая ўдарніца ў калгасе. У мінулым годзе выпрацавала 268 працадзён, а ў гэтым — ужо 167. Тры гады працуе Мар'я адказнай па ільну.

— У мінулым годзе наш лён прынялі дзесятым - дванаццатым нумарам, а ў гэтым, — заяўляе Мар'я, — наш лён пойдзе не ніжэй 16 нумара.

Устане бывала Мар'я гадзін у 6 раніцы і пойдзе са сваім звяном лён палоць. А ўвечары, калі пачне ахутваць зямлю шэрая начная цемра, з-за лесу даносяцца звонкія галасы калгасніц:

Разграмілі атаманаў,
Разагналі воявод
І на ціхам акіяне
Свой закончылі паход.

Гэта спявае, ідучы з работы. Мар'іна звяно. Шмат навучыліся калгасніцы новых совецкіх песняў. Радуецца Мар'я. Ды чаму і не парадавацца ёй ад такога вясёлага калгаснага жыцця? І таму так часта ўспамінае Мар'я апошнія словы свайго Фёдара:

— Іду ваяваць, Мар'я, каб потым нам і дзецям нашым было добра.

Яго словы збыліся. Той самы трохгадовы хлопчык Пеця зараз ужо вучыцца ў Гомельскім машына-будаўнічым інстытуце.

— Хутка мой Пеця будзе інжынерам, — гаворыць Мар'я і на яе загарэлым твары свеціцца радасная ўсмешка.

Ёсць і яшчэ адна вялікая радасць у Мар'і — яна сваёю ўдарнай працай заваявала права падпісаць пісьмо знатных людзей Беларусі таварышу Сталіну. Зараз Мар'я знатны чалавек раёна.

П. Барысёнка.

Калгас „Комінтэрн", Клімавіцкі раён.

ВУЧОБУ НЕ ПАКІНУ

Брыгада, у якой я работала памеснікам брыгадзіра, у калгасе імя Молатава была перадавой. За ўдарную работу МТС мяне вылучыла на вучобу, — на 6 месячныя курсы брыгадзіраў пры раённай калгаснай школе.

Цяжка мне малаграматнай было вучыцца, але настаўніцы **Кулікоўская, Вертліб** і загадчыца тав. **Крываносава** прышлі мне на дапамогу. Штодзённа яны дапамагалі мне рыхтавацца к заняткам, растлумачвалі незразумелыя для мяне пытанні. У выніку іх таварыскай дапамогі, я атрымала многа ведаў і паспяхова скончыла курсы.

У жніўні звярнулася з курсаў у свой калгас і мяне зараз-жа вызначылі брыгадзірам. Брыгада мая не адстае, а ідзе ўвесь час уперадзе па ўборцы ўраджая.

Вучоба мне шмат дапамагла. Я на практыцы ўпэўнілася, як нам маладым комсамолкам неабходна вучыцца, каб умець быць кіраўнікамі на калгаснай вытворчасці.

Вучобу я не пакіну, буду вучыцца далей.

Крывіцкая Аня.

Крычаўскі раён.

РАЗЛІЧЫЛІСЯ З ДЗЯРЖАВАЙ

За сем дзён выцерабілі 56 га лёну ў калгасе «Беларуская вёска». Пры церабленні праводзілі двайное сартаванне. 14-га жніўня поўнасцю выбралі ўвесь лён і прыступілі да масавага расціла.

Першыя 10 га лёну, які церабілі выбарачным парадкам і расцілалі, мы ўжо падымаем і рыхтуем валакно для здачы дзяржаве. Па спыткам лён прызнан высокай якасці.

Пры ўборцы ільна сярод калгасніц разгарнулася соцспаборніцтва. Спаборнічалі паміж сабой звенні і брыгады. На першае месца вышла другая брыгада (брыгадзір тав. Бессмертны) і ўзяла на грамадскі буксір першую брыгаду.

Усе 160 га зжатага жыта звезены ў амбары. Добраякаснае жыта першага абмалота здалі дзяржаве і да 15 жніўня поўнасцю разлічыліся па хлебапастаўкам.

З радасным, бадзёрым настроем мы пачалі сяўбу азімых.

Нам. старшыні па ільну
член ЦВК БССР

Кавалёва.

Лёзненскі раён.

СПРАВЫ І ДН

Аўтабус спыніўся ў некалькіх кроках ад фабрычнага фасада. На лаўках адзіночкамі і групамі сядзелі работніцы і рабочыя. Праз поўгадзіны яны павінны прыступіць да сваёй змены. А пасядзець на фасадзе — прыемна. Прыемна ўдыхаць пах віргінь, лілеяў, хрызантэм. Прыемна глядзець на іх — такіх прыгожых і свежых.

Член ЦВК тав. Мацвеява.



Брыгадзір матальнага цэха т. **Механікава.**

Кветкі на фабрыцы ўвайшлі ў быт. Цяжка знайсці такі куток, дзе-б іх не было. Яны ўпрыгожваюць двор, цэхі, машыны, рабочае месца. Яны з'яўляюцца аднэй з многіх сведак узросшай культуры фабрыкі.

Сярод прамысловасці Совецкай Беларусі шоўкавая фабрыка імя Куйбышэва займае адно з перадавых месц. Месца гэта рабочым, інжынэрна-тэхнічным і кіруючым калектывам фабрыкі заваёвана ў барацьбе з цяжкасцямі, у штодзённым імкненні працаваць лепш чым учора. Гэта даказвае некалькі асноўных паказчыкаў работы фабрыкі.

За першае паўгоддзе 1935 года план быў выканан на 107,3 проц. За ліпень—на 111,1 проц. Прадукцыя першага гатунка за паўгоддзе замест планавых 67 проц. складае 86,9. 4-га гатунку—замест планавых 2,3—1,1 проц. Прадукцыйнасць працы ўзрасла на 7,7 проц.

У сувязі з павышэннем прадукцыйнасці працы значна ўзрасла заработная плата рабочых. У 1934 г. сярэдняя месячная зарплата рабочага складала 140 руб., а ў першым паўгоддзі 1935 года—174 руб.

Пытанне рэнтабельнасці з'яўляецца аднэй з галоўных задач рабочага калектыва і яго кіраўнікоў. У мінулым годзе фабрыка дала каля мільёна звышпланавых накапленняў. У гэтым годзе фабрыка абавязалася даць дзяржаве звышпланавых накапленняў 2 мільёна 750 тысяч рублёў. Гэта абавязацельства не засталося на паперы. Мільён 332 тысячы рублёў дадзена ўжо за першае паўгоддзе 1935 г.

„З усіх каштоўных капіталаў, якія маюцца ў свеце, самым каштоўным і самым рашаючым капіталам з'яўляюцца людзі, кадры", — сказаў таварыш Сталін у сваёй гістарычнай прамове на выпуску акадэмікаў. Гэтыя словы бліскуча пацвярджаюцца на людзях шоўкавай фабрыкі.

Вось майстар матальнага цэха **Гурвіч** Ліза. Колькі старанняў укладвае яна ў сваю асноўную і грамадскую работу цэха. Яна, як парторг цэха, клапаціцца і аб жыцці комуністаў, і аб выкананні плана, і аб масавай рабоце ў цэху. Вось брыгадны майстар **Нізкіна** Бела. Яе ў матальным цэху, ды і ва ўсёй фабрыцы ведае кожны як старанную работніцу і грамадскую працаўніцу. Вось вылучэнка, былы слесар, зараз сакратар комсамольскага камітэта, таварыш **Лабовіч**. Яе любіць і паважае не толькі моладзь, але і старэйшыя рабочыя. Надзвычай добры растучы работнік на фабрыцы, член ЦВК БССР тав. **Мацвеева.**

Такіх людзей на фабрыцы велізарная колькасць. Яны растуць на рабоце, авалодваюць тэхнікай не толькі свайго працэса, але і кіраўніцтва.

Вялікія перспектывы мае фабрыка. Для рэканструкцыі (пераабсталявання) яе дзяржавай адпушчана 24 мільёна рублёў, з іх 6 мільёнаў на будаўніцтва дамоў для рабочых, клуба і іншыя бытавыя ўстановы. Работы па рэканструкцыі ўжо распачаліся. Гэта дасць магчымасць на многа павялічыць выпуск шоўка. 8,2 тысячы *кг* шоўку ў дзень будзе выпускаць



Фасад Магілеўскай шоўкавай ф

ДНІ ШОЎКАВАЙ

фабрыка замест выпускаемых зараз—6 тысяч *кг.*

7-га лістапада, у дзень 18-годдзя Окцябрскай рэволюцыі фабрыка будзе святкаваць пяцігоддзе свайго існавання. К гэтаму дню рабочы калектыў рашыў напісаць гісторыю сваёй фабрыкі пад назвай: „Справы і дні шоўкавай". Рабочым, работніцам і кіраўнікам фабрыкі ёсць аб чым напісаць.

Магілёў. **Шыфрына.**

ПА ПРЫКЛАДУ ЛЕПШЫХ

Ужо другі квартал наша брыгада № 4 матальнага цэха ідзе першай у цэху па ўсім паказчыкам. Гэта для мяне—майстра брыгады і для астатніх нашых 60 работніц з'яўляецца вялікім гонарам.

Пяршынства далося нам не лёгка. Доўга брыгада была ў прарыве. Але калі мы разгарнулі соцспаборніцтва паміж работніцамі, пачалі праводзіць з работніцамі штодзённую масавую работу, план стаў выконвацца.

Брыгадзірамі ў брыгадзе працуюць былыя матальшчыцы **Лусто** і **Клачкова.** Добрыя брыгадзіры і адначасова добрыя грамадскія працаўніцы. Лусто—комсамольскі арганізатар, а Клачкова—прафорг. Яна скончыла курсы ПВО і зараз кіруе гуртком.

Лепшыя ўдарніцы ў нас **Варапаева, Соркіна, Падалінская, Зубчэўская** і другія. Лепшымі вядома сталі яны не адразу. Узяць напрыклад тав. Зубчэўскую. Яна прышла ў брыгаду з фабзавуча. Спачатку працавала дрэнна, давала многа браку. Зараз Зубчэўская з'яўляецца прыкладам для астатніх работніц.

Нашы работніцы амаль усе вучацца. Я кажу амаль—таму, што **Фельзот, Мядзвецкая** і яшчэ некаторыя імкнуцца ўвільнуць ад вучобы. Не раз яны абяцалі вучыцца, але пакуль абяцанне не выконваюць.

Многа нам дапамагае ў рабоце зменны інжынер брыгады, член партыі тав. **Абрамкін**, асабліва ў выпуску насценгазеты. А газета ў нас адна з лепшых на фабрыцы. Яна моцна б'е бракаробаў і гультаёў—заметкай, карыкатурай, вершам. Вось верш, прысвечаны работніцы **Лапіцкай** за выпуск дрэннай прадукцыі, змешчаны ў штодзёнцы.

Контролеры ОТЭКА
Так везде и рыщут,
Прячь моток хоть в облака,
Все равно разыщут.
А вось пра работніцу **Даураву:**
Как работать ночью выйдет
Здесь хоть цех пускай горит,
Все равно всегда спокойно
За машиной стоя спит.

Такая крытыка дае добрыя вынікі.

Вядома, ёсць у нас і недахопы. Яшчэ не ўсе даюць добрую якасць прадукцыі. Не ўсе трымаюць у чыстаце рабочае месца. Рыхтуючыся да пяцігоддзя існавання фабрыкі, мы ўзялі на сябе рад абавязацельстваў. Галоўнае абавязацельства — не здаць пяршынства. І мы яго не здадзім.

Ніскіна Бела.



Тав. Лабовіч.

Тав. Касінец—майстар матальнага цэха.



брык імя тав. Куйбышэва.

МОЙ ПЕРШЫ ПРЫЖОК

Сем'я парашутыстаў: **Таня Аргасава**, яе муж **Патапаў** і дачурка **Рэгіна**.

Успамінаюцца мне дзіцячыя, школьныя гады. Калі мне было 9 год, недалёка ад мястэчка Лёзна, дзе мы жылі, спусціўся самалёт. Мне вельмі хацелася паглядзець, што гэта за «птушка» прыляцела.

Пабеглі мы — дзетвара цэлай гурбой да самалёта. Спачатку мы палахліва глядзелі на вялікую сталёвую машыну з распрасцёртымі крыллямі. Але потым, калі лётнікі нам расказалі, якія цуды машына робіць, мы трохі супакоіліся.

Пачала я і сама будаваць мадэлі самалётаў, але яны ў мяне не ляталі, хоць і былі падобныя на самалёты. Марыла я паступіць у школу лётнікаў.

Ужо, калі займалася ў Віцебскім фабзавучу, аднойчы прачытала я, што ўтвараецца прыём у школу лётнікаў. Абрадавалася і пайшла туды. Але было мне толькі 17 год і мяне не прынялі. Праз год, калі я ўжо працавала на фабрыцы, паступіла на курсы планерыстаў.

Планерная справа мне вельмі спадабалася і школу я скончыла з поспехам. Цяпер я на фабрыцы кірую гуртком планерыстаў, у якім навучаецца 29 чалавек.

Зараз мяне вельмі зацікавіў парашутны спорт. Мы з **Слесаравай** Дорай, якая таксама працуе на фабрыцы і скончыла без адрыву ад вытворчасці лётную школу, паставілі перад сабой мэту — стаць добрымі парашутысткамі.

Разам прайшлі мы ў аэраклубе 36-гадзінную праграму па парашутызму, але адначасова зрабіць прыжкі нам не прышлося. 27 ліпеня была чарга Доры прыгаць. Яе прыжок мяне яшчэ больш захапіў і я не магла дачакацца сваёй чаргі.

Нарэшце 4 жніўня мне паведамілі:

— 6 жніўня вы прыгаеце з парашутам.

Ад радасці я танцаваць пашла.

6-га праснулася рана, бачу: дождж.

— Ну, —думаю я сумна, — прыгаць не прыдзецца.

Але-ж я ўстала, паснедала і пайшла ў аэраклуб.

Дождж спыніўся, паказалася сонца. Надвор'е станавілася ўсё лепш і лепш. На аэрадроме інструктар тав. Семчэнка растлумачыў нам яшчэ раз, як трэба вылезці з самалёта, каб зрабіць прыжок.

Чаканая мінута настала. Самалёт плаўна адарваўся ад зямлі і пачаў набіраць вышыню. Першы круг машына ішла хутка, але-ж другі яна рабіла павольна і мне здавалася, што пройдзе цэлая гадзіна пакуль мы набярэм патрэбную вышыню. Гляджу — высотаметр паказвае 700 метраў. Паглядзела я на інструктара і зрабіла запытальны знак: ці можна вылязаць?

— Паспееш, — адказаў ён мне.

Раптам заціх матор і інструктар сказаў: — Цяпер можна!

Левай рукой я ўзялася за стойку плоскасці, правай — за борт і пералезла праз кабіну. Па плоскасці падышла да другой кабіны, дзе сядзеў інструктар. Ён адзеў мне на правую руку гумку, я ўзялася за кальцо і падрыхтавалася.

— Гатова? — запытаў ён.

— Ёсць, гатова.

— Ну, прыгай!

Паглядзела ўніз. Здалося, што сустрэнуся з зямлёй, не паспеўшы раскрыць парашут. Але гэтую думку я адразу пакінула і.. ўніз галавой.

У гэты-ж момант я вырвала выцяжное кальцо. Спачатку выляцеў маленькі парашуцік, за ім распусціўся вялікі белы купал, і я апынулася ў седзячым становішчы.

Тут я пачала выконваць усе правілы, якім нас навучаў інструктар. Праверыла ці правільна распусціўся купал. Упэўніўшыся, што ўсё ў парадку, я зняла з рук кальцо і прывязала яго да лямкі. Гляджу — нясе мяне прама на аэрадром. Знізілася я не вельмі хутка, вецер дзмуў у бок. Перахапіла я лямкі і разгарнулася па ветру, каб лепш было прызямляцца.

А зямля ўсё набліжалася і набліжалася. Раптам я нагамі дакранулася да зямлі і адчула невялікі штуршок. Парашут упаў на зямлю. Яго ветрам пацягнула і я легла на бок. Схапіла верхнія стропы і ўскочыла на ногі. Радасці маёй не было канца.

Спірыдонава Фруза.

Віцебск, фабрыка
„Сцяг індустрыялізацыі".

ЗА ЛЕПШУЮ ГРУПУ

Комсамольскім арганізатарам я работаю нядаўна, але нагрузка гэта мне падабаецца. Жывая, цікавая работа. У групе ў нас 35 комсамольцаў, з іх 33 дзяўчыны. Комсамольцы ў большасці даюць лепшыя паказчыкі ў вытворчай рабоце. Комсамольская брыгада работае па вопыту менжынцаў — гэта адна з лепшых брыгад у цэху.

Прыкладныя комсамольцы ў нас **Вербіцкая, Кіселёва, Ляхоцкая, Голуб, Сэльц** і другія. Яны добра работаюць і добра вучацца. Нажаль гэтага нельга сказаць аб комсамолках **Талісмахер** і **Тэкліцкай.** Яны палітычна няграматныя, а вучыцца не жадаюць.

Значна ажывілася ў нас комсамольская работа пасля пастановы ЦК ВЛКСМ аб рабоце сярод жаночай моладзі. Больш сталі цікавіцца бытам комсамолак. Групоргі ў многіх пабывалі дома. Абследвалі становішча кватэр комсамольцаў і зараз дабіваюцца рамонту кватэр для Партнога, Шамес і яшчэ некаторых. Частцы моладзі павысілі разрады. Так Барашку з 5 перавялі на 6, **Берэнштэйн, Жабровіч** і другіх перавялі з 4 на 5.

Нельга быць добрым комсоргам без сістэматычнай вучобы. Я гэта на сябе адчуваю. Вучуся ў вячэрнім комвузе, перайшла ўжо на другі курс. Чытаю «Комсомольскую правду» і «Рабочий». Чытаю таксама і мастацкую літаратуру. За апошнія 3-4 месяцы прачытала: «Паднятую цаліну»—Шолахава, «Над ракой Арэсай»—Купалы, «Дрыгву»—Коласа і «Что делать»—Чарнышэўскага. Многа чытаюць таксама комсамолкі **Вербіцкая, Кіселёва, Голуб Ф., Каган.**

Мая мэта зрабіць комсамольскую групу лепшай на фабрыцы. Я ўпэўнена, што хутка гэта будзе.

Кітайчык.

Мепск, фабрыка „Окцябр".

Тав. **Кітайчык.**

Андрэй Ушакоў

БУДУ ЛЁТЧЫКАМ

Помню, за ўдарную работу—
Палятаць — пуцёўку даў завод.
Лётчык малады з аэрапорта
Пасадзіў мяне на самалёт.

Мчымся мы ў паветраным бяздонні,
Так што закружыла ў галазе...
Цэлы свет ляжыць, як на далоні,
У нявыказна дзіўным харастве.

Пада мной праходзяць долы, горы
І пярэстыя шнуры палёў.
Я крычу праз гучны гул матора,
Каб пілот цішэй машыну вёў.

Разглядзець і распазнаць хачу я
Вуліцу сваю, заводскі дом.
Толькі лётчык голасу не чуе
І сядзіць спакойна за рулём.

Многа перажыта, пазабыта
Не забыты гэты слаўны дзень:
Ходзіць следам, не дае мне збыту
Думка неадчэпная, як цень.

Я хачу стэповыя абшары
Залатой пшаніцай засяваць.
Я хачу ў лясах тушыць пажары,
На пасевы дожджык праліваць.

І сачыць, як у густым тумане
Вораг крадзецца каля граніц.
Я хачу так, як герой Каманін,
Не баяцца бур і навальніц...

Хай скаголіць вецер шэрым воўкам
Праз завеі, маразы і стынь,—
Прывязу на полюс у зімоўку
Свежыя газеты і лісты.

Чую на дарозе цвёрдасць крокаў,
Выйду я насустрач — прывітаць.
— Добры дзень, мой любы, сінявокі!
Дай мне раду, як пілотам стаць.

Ён смяецца... Погляд прамяністы,
Нібы сонца развявае сум...
... Вечарам у школу планерыстаў
Я сваю заяву панясу..

Вырашчваем людзей



Лозунг нашага любімага правадыра тав. Сталіна «кадры вырашаюць усё» патрабуе ад нас усіх клапатлівага вырашчвання людзей. Я хачу расказаць аб тым, што намі зроблена па ажыццяўленню гэтага лозунга.

За апошнія тры месяцы мы вылучылі на розныя адказныя пасады ўнутры фабрыкі 12 чалавек. Сюды ўваходзіць старшыня фабкома тав. **Пекер**, раней вылучаная намеснікам старшыні фабкома, **Дымшыц** — начальнік змены, **Карбуцкая** — інструктар і другія.

Старанна працуюць вылучэнкі. Асабліва я задаволена работай т. т. **Пеўзнер** і **Дымшыц**. Пеўзнер работае інструктарам і цэхавым парторгам. Яна адна з лепшых парторгаў. Растучы чалавек. Добра вучыцца. У яе цэху лепш чым усюды пастаўлена партыйна-масавая работа. Дымшыц работае начальнікам змены. Гэта сапраўдны гаспадар змены, добры арганізатар і масавік. У рабочых карыстаецца заслужаным аўтарытэтам.

6 новых інструктароў і майстроў вылучаны намі з моладзі.

За апошні час палепшылася ў нас тэхнічная вучоба рабочых. Да прамовы тав. Сталіна на выпуску акадэмікаў Чырвонай арміі тэхэкзамен здалі 600 чалавек, зараз іх 1100. Выдатнікаў было 400, зараз — 700. Для падняцця кваліфікацыі інструктароў і майстроў арганізавана школа, у якой вучыцца 50 чалавек. Усе комуністы наведваюць партыйныя школы. Акуратна занімаюцца вучобой усе 37 спачуваючых. 100 чалавек наведваюць курсы профактыва.

Не малае значэнне ў вырашчванні людзей мае палепшанне бытавых умоў рабочых і работніц. Тут у нас таксама ёсць некаторыя дасягненні. За ўвесь мінулы год у доме адпачынку было 146 чалавек. За першае паўгоддзе гэтага года — 158. На курорт у мінулым годзе было паслана 18 чалавек, а за гэта паўгоддзе — 28 чалавек.

У пяршыню за сваё існаванне дзіцячыя яслі былі цэлае лета на дачы. На фабрыцы арганізован новы дзіцячы сад. 45 дзяцей былі пасланы ў дзіцячыя санаторыі. Гэтыя клапоты аб дзецях далі магчымасць многім работніцам вучыцца і павышаць сваю кваліфікацыю.

Вядома, зробленае намі з'яўляецца толькі пачаткам. Упераде прадстаіць яшчэ многа работы па клапатліваму выхоўванню нашых кадраў.

Бахрах.

Сакратар парткома ф-кі імя Валадарскага.

Магілёў.

Ударніцы актывісткі ф-кі імя Валадарскага тт. **Каганова, Крэйдзіна, Пеўзнер**

НАШЫ ДЗЯЎЧАТЫ

Комсамольская арганізацыя швейнай фабрыкі імя Валадарскага ў большасці складаецца з дзяўчат. З 109 комсамольцаў — 93 дзяўчыны. Адсюль зразумела, што пастанова ЦК ВЛКСМ аб рабоце сярод жаночай моладзі нас асабліва датычыцца. Прапрацавалі мы гэту пастанову не толькі сярод комсамолак, але і сярод беспартыйнай моладзі.

Асабліва цікава прайшоў сход па абгаварэнню даклада тав. **Васільевай.** На ім высказаліся дзяўчаты, якія ніколі на сходах не выступалі. Тут-жа высветлілася, што адна маладая работніца-адзіночка, жадаючы схаваць сваю цяжарнасць, насіла карсет. Калі мы бліжэй падыйшлі да гэтай работніцы высветлілася, што будучае мацярынства яе палохае больш усяго з-за дрэнных кватэрных умоў. Зараз ёй вызначылі асобны пакой у інтэрнаце, забяспечылі дыэтхарчаваннем, стварылі таварыскую абстаноўку на фабрыцы і яна зразумела шкоднасць сваіх мінулых дзеянняў.

Мы пачалі вылучаць комсамолак на адказныя работы. 6 дзяўчат ужо працуюць інструктарамі і майстрамі ў цэхах. Са сваёй работай яны дастаткова спраўляюцца. 7 комсамолак з'яўляюцца комсоргамі, а ўсяго на фабрыцы комсоргаў — 8.

Больш сур'ёзна мы ўзяліся за падрыхтоўку беспартыйнай моладзі к уступленню ў комсамол. У цэху № 2 займаюцца ў гуртку па вывучэнню праграмы і статута ВЛКСМ 20 беспартыйных дзяўчат. Многія з іх ужо падалі заявы аб уступленні ў КСМ. Камсоргам у гэтым цэху тав. **Клаз** — энергічная, добрая

На фанерным заводзе

Завод наш стары. Пабудаваў яго фабрыкант Лурье ў 1903 годзе. Вядома, як будаваў стары гаспадар: сабе пабольш карысці, а аб рабочым — клапот мала.

Стары завод меў толькі дзве лушчыльных машыны і адзін варыльны прэс. У сучасны момант завод наш пашыран, маецца пяць лушчыльных машын і тры варыльных прэса. Пашыран і сартыровачны і абрэзны цэх. Установлена новае кацельнае аддзяленне. Культурна стала ў цэхах.

Каля 60 проц. рабочых нашага завода — жанчыны. Жанчыны працуюць у нас на адказнейшых кваліфікаваных работах: клейка фанеры, сартыроўка шпона, сартыроўка абрэзной фанеры. Толькі мала займаемся мы тэхвучобай. Ахоплена тэхвучобай 156 чалавек (з іх 75 проц. жанчын). Здалі тэхэкзамен — 65 чалавек.

Выдатнікаў абяцалі перавесці на больш кваліфікаваную работу, але гэта засталося толькі абяцаннем. Нават значкоў «ЗОТ» мы да гэтага часу не атрымалі.

Кіраўнік тэхнічнай вучобы тав. **Шафранаў** мала ўвагі ўдзяляе гэтаму адказнейшаму ўчастку на вытворчасці. Заўсёды ён заняты другой работай.

Дрэнна пастаўлена ў нас і культработа. Клуб наш знаходзіцца ў горадзе — за 4 кіламетра.

Сярод жаночай моладзі ніякай работы не праводзіцца. Комсамольскі камітэт не зрабіў для сябе ніякіх вывадаў з рашэнняў ЦК ЛКСМБ па гэтаму пытанню.

Завод наш чырвонасцяжны і мы работніцы - ўдарніцы гэтага прадпрыемства маем права на большую ўвагу, на большую дапамогу з боку нашых кіруючых работнікаў.

Шульман Голда.

Мозыр, завод „Чырвоны Окцябр".

НАШЫ ДЗЯЎЧАТЫ

(Працяг)

комсамолка. Добра працуюць сярод беспартыйнай моладзі і комсоргі т. т. **Каган** і **Айнбунд.**

Некаторых комсамолак - мацярэй у нас лічылі «мёртвымі душамі». Сталі яны такімі ў большасці па віне дрэннай работы комсамольскага камітэта. Гэта яскрава выявілася на праведзенай Магілёўскім райкомам ЛКСМБ нарадзе мацярэй - комсамолак.

І сапраўды, варта было пабываць дома ў комсамолак - мацярэй **Шэндэравай** і **Калікінай,** па таварыску з імі пагаварыць, і рэзультат атрымаўся станоўчы. Яны сталі наведваць сходы, палітвучобу і цікавіцца комсамольскім жыццём. Работа сярод жаночай моладзі становіцца штодзённай справай нашай комсамольскай арганізацыі.

Сакратар комсамольскага камітэта **Сагал.**

Магілёў.

КЛОПАТЫ — АБ ЛЮДЗЯХ

Трохкутнік нашага гваздзільнага завода «Красный Октябрь» не мала клапоціцца аб палепшанні бытавых умоў рабочых і работніц. Лепшым ударнікам адрамантавалі кватэры — пакоі выклеілі шпалерамі, афарбавалі падлогі і прыводзяць памяшканні ў культурны выгляд. Гэта стварае ўмовы для лепшага, культурнага жыцця.

Многа ўдзяляюць у нас увагі дзецям. Радасна і шчасліва праводзяць яны сваё дзяцінства. Якімі клопатамі абкружаюць іх, колькі сродкаў траціць на іх наша дзяржава! На нашым заводзе ў гэтым годзе на час летніх канікул накіравалі 18 дзяцей рабочых у санаторыі і 40 — ў піонерскія лагеры.

Дзеці адпачывалі добра і паправілі сваё здароўе. З новымі сіламі яны цяпер прыступаюць да вучобы.

Мацылевіч Марыля, Безлюдава Ксеня.

Орша.

СУР'ЁЗНЫ НЕДАХОП

На Белэнергакамбінаце, асабліва ў цэхах паліўным і торфпадачы большасць рабочых — маладыя дзяўчаты. Многія з іх лепшыя ўдарніцы, лепшыя людзі камбіната.

Вішнеўская — у мінулым чорнарабочая, няграматная, саромлівая дзяўчына. Цяпер яна лепшая работніца торфападачы. Добрая комсамолка — актывістка.

Пуцькова М. — калгасніца, прышла на станцыю няграматнай. Спачатку работала чорнарабочай, а зараз — загадчык склада. Пяць разоў прэміравана.

Можна пералічыць многа такіх дзяўчат, якія растуць ідэйна і павышаюць сваю кваліфікацыю.

Адно дрэнна, — работніцы пасля работы не маюць магчымасці культурна і разумна скарыстаць свой адпачынак. Няма гурткоў самадзейнасці. Вінаваты ў гэтым у першую чаргу камітэт комсамола, які зусім недастаткова работае сярод беспартыйнай моладзі.

Вілі.

Орша.

БУДЗЕМ ЖЫЦЬ ЯШЧЭ ЛЕПШ

На чыстым сакавітым мураж-ку пасвілася больш 50 цялят. Некаторыя з іх пад'еўшы ляжалі, грэючыся на сонцы. Цяляты былі добрыя — швіцкай і беларускай пароды.

— Добры дзень! — прывіталіся мы з даглядчыцай цялят.

— Добры дзень! — адказала ўжо не маладая калгасніца **Касцеева** Ксеня.

Тут-жа на лужку мы разгаварыліся з Ксеняй.

— З першых дзён арганізацыі калгаса я працую даглядчыцай на ферме. Палюбіла гэту работу. Ведаю, калі кожны цялёнак нарадзіўся, якой маткі.

— А колькі ў вас падзяжа?— пытаемся ў Ксені.

— А што гэта такое?

— Загінула цялят колькі ў вас цяпер і ў мінулым годзе? — тлумачым мы.

— Ніводнае не загінула — мы даглядаем добра. Я нікога не пускаю ў цялятнік з пабочных асоб, нават сваіх калгаснікаў. Цвёрда прытрымліваюся рацыёна пры кармленні—даю ім есці згодна распісання. Кожнае цялё мыем, чысцім іх станкі, даглядаем іх, як добрая маці сваіх дзяцей. Нядаўна захварэў цялёнак — не еў нічога, вушы апусціў. Я сама зрабіла яму мікстуру. Два разы дала і ён папраўіўся, а калгаснікі гаварылі, што трэба прырэзаць.

Калгас «Большэвік» — адзін з лепшых у раёне па развіццю жывёлагадоўлі. У гэтым мае вялікую заслугу ўдарніца калгаса **Касцеева** Ксеня. За пяць год работы на ферме яна выгадавала больш 150 галоў маладняка. З іх ёсць ужо добрыя каровы і бычкі.

Ксеня — лепшы змагар за калектывізацыю. Яна першая ўступіла ў калгас у 1929 годзе і пацягнула за сабой сваіх суседак, братоў і сясцёр. Ёй кулакі пагражалі забойствам, спайвалі яе мужа, каб ён збіў яе і забараніў дапамагаць мясцовай парт'ячэйцы і сельсовету ў арганізацыі калгаса. Але яна гэтага не палохалася.

Ксеня расказвае, што калі яна была членам сельсовета, прыехаў аднойчы кулацкі агент з раёна, нехта Конанаў, назваў сябе прадстаўніком РВК і прапанаваў калгасы распусціць, бо яны чічога не дадуць. Яна яму адказала, што ён не прадстаўнік раённай ўлады, а прадстаўнік ад кулакоў. Тады Конанаў даў распараджэнне, каб яе з сельсовета выгналі, але беднята не паслухалася і прагнала яго са схода.

Касцеева была дзесяць год членам прэзідыума сельсовета, добра выконвала розныя нагрузкі.

Зараз Ксеня жыве культурна і заможна. Зойдзеш да яе ў хату —чысты пакой, засланы белым абрусам стол, вокны завешаны чысценькімі фіранкамі, вазоны з кветкамі.

— Раней мы не так жылі, — расказвае Ксеня. — Не да гэтага было нам. Хоць сям'я наша была малая, але хлеба не хапала.

У мінулым годзе Ксеня з мужам і дзяўчынкай выпрацавалі 1.000 працадзён, на якія атрымалі 120 пудоў хлеба, 500 пудоў бульбы, акрамя бульбы атрыманай са свайго агарода. Ксеня мае карову, 2 цёлкі і свінаматку з 5 парасятамі.

— У гэтым годзе, — сказала Ксеня, — мы яшчэ лепш будзем жыць таму, што цяпер лепшы ўраджай, чым у мінулым годзе і лепш працуюць. Адно дрэнна, што я зусім малаграматная і з намі ніхто не займаецца.

Вальфсон.

Капаткевіцкі раён.

Даярка калгаса „Чырвоная Бярэзіна, Бабруйскага раёна **Славіна Тайба.**



Калгасніцы Петровіцкага сельсовета, Смалявіцкага раёна навучаюцца ездзе на велосіпедах.

ВЫРАСЛА ФЕРМА

У 1929 годзе я была адна з першых арганізатараў нашага калгаса. З гэтага-ж году я працую на малочна-таварнай ферме даяркай. Мае 12 кароў добра дагледжаны.

Памятаецца мне якую барацьбу прышлося весці з падкулачнікамі, што імкнуліся разбурыць калгас. Вясной 1930 года, як раз у пасеўную, пад уплывам кулацкай агітацыі некаторыя неўстойлівыя людзі пачалі выходзіць з калгаса. Пачалі забіраць сваіх коней. Я была тады на канюшні, калі падышла **Ананіч** і хацела забраць свайго каня. Я не пусціла. Тады Ананіч пачала мяне біць і кінула аб зямлю. За гэта суд прысудзіў яе да двух год пазбаўлення волі.

Прайшло некалькі год. Ананіч убачыла добрае жыццё ў калгасе і папрасіла, каб яе зноў прынялі. Цяпер яна ўспамінае гэты час і кажа, што класавыя ворагі нашэптвалі ёй выйсці з калгаса.

Шмат часу прашло з гэтага моманту. Вырас наш калгас, выраслі людзі.

У пачатку арганізацыі фермы было 15 кароў, а цяпер мы маем буйнай рагатай жывёлы 92 штукі, з іх дойных кароў — 42, цялят 48.

У нашым кароўніку цяпер чысцей, чым раней было ў сялянскай хаце. Кароўнік прасторны, выбелен, гарыць электрычнае святло. У кароўніку ёсць умывальнік і ручнік. Перад дойкай даяркі акуратна мыюць рукі, падмываюць каровам вымя.

Нядаўна наша ферма ўключылася ў конкурс на лепшую МТФ. Мы ўзялі на сябе абавязацельства поўнасцю выканаць план малакапастаавак і ў тэрмін, выканаць і перавыканаць план вырошчвання маладняка і ўкамплектавання стада, ліквідаваць ялавасць. Мы абавязаліся павялічыць удой малака і прырост жывёлы.

Разам з ростам калгаса вырасла і я. Былая беднячка стала цяпер знатным чалавекам. За ўдарную работу праўленне калгаса мяне нядаўна накіравала ў

Жывёла калгаса „Большэвік" Барысаўскага раёна на пашы.

Ждановіцкі дом адпачынку. Там я адпачыла і паправіла сваё здароўе.

Жыву я цяпер заможна. Раней у мяне ніколі не хапала хлеба, а цяпер ў 1934 годзе я выпрацавала 500 працадзён, атрымала вельмі многа прадуктаў. Маю зараз карову, цёлку, свіней і птушак. У хаце ў мяне чыста і культурна. Усё гэта вынік калгаснага ладу, які мы павінны берагчы, як зяніцу вока.

Вішнеўская Марыля.

Дзяржынскі раён,
калгас „Чырвоны баец".

СЛОВЫ НЕ РАЗЫХОДЗЯЦЦА СА СПРАВАЙ

Радасна спаткала мяне загадчыца СТКФ калгаса «Іскра». З усмешкай на твары яна паказала паглядзець свінарнік і парасят.

— Ведаеце, ферма нашага калгаса працавала дрэнна, — кажа **Лебедзева**.—Памяшканне было бруднае. Вялікі адыход маладняка. Мне прапанавалі быць загадчыцай. Баялася брацца за гэту работу. Думала не спраўлюся. Падбадзёрвала сябе тым, што маленькі вопыт маю: некалькі год працавала на ферме ў другім калгасе.

Энергічна ўзялася я за працу. Навяла парадак у свінарніку. І справы на ферме змяніліся, свінарнік стаў чыстым і свежым, станкі прыведзены ў парадак. Гадую ўжо другі апарос. 19 парасятак нарадзілася. Усе маюць вышэйсярэднюю ўпітанасць.

Мы вышлі са свінарніка. На полі пасвіліся парасяткі чыстыя і гладкія.

— Кожны дзень, — працягвала Лебедзева, — я парасят мыю. Кормім тры разы. У мяне адно жаданне: зрабіць ферму лепшай у раёне. Хачу вучыцца і працаваць.

Словы Лебедзевай не разыходзяцца са справай. Яна чытае зоатэхнічную літаратуру і павышае сваю кваліфікацыю.

Лебедзева прымае актыўны ўдзел у рабоце калгаса. Яна з'яўляецца членам сельсовета. На яе пункце добра выконваюцца ўсе гаспадарча - палітычныя кампаніі.

Хадарэнка.

Лёзненскі раён.

НАША ПРЫГАРАДНАЯ

Усе чыгуначнікі станцыі Жлобін у гэтым годзе поўнасцю забяспечаны гароднінай. Нашы работніцы і хатнія гаспадыні цяпер ходзяць за гароднінай не на рынак, а ў сваю краму, дзе атрымоўваюць у дастатковай колькасці бульбу, агуркі, цыбулю, памідоры, капусту.

Патрэбна адзначыць, што чыгуначнікі ў час праполачнай не мала дапамаглі сваёй прыгароднай гаспадарцы.

Цяпер перад намі задача: своечасова ўбраць гародніну. Усе чыгуначнікі нашага вузла павінны прыняць актыўны ўдзел у тым, каб усё засеянае было ўбрана і правільна захавана. Гэта дасць нам магчымасць забяспечыць усе нашы сем'і гароднінай да новага ўраджая.

Е. Чэботар.

Жлобін.

Там, дзе раджаюць і лечацца

Акушорска-гінекалагічнае аддзяленне Магілёўскай бальніцы перабудавана па ўсім запатрабаванням совецкай медыцыны.

Светлыя палаты афарбаваны белай і блакітнай фарбай і разлічаны на 6—8 чалавек. Новыя нікеліраваныя ложкі з мяккімі матрацамі, беласнежная пасцельная бялізна, ідэальная чыстата і свежае паветра ствараюць у палатах утульнасць і неабходны спакой.

Рухнулі векавыя непісаныя законы аб немагчымасці ў больніцах мець кветкі, мяккую мэблю, венскія крэслы. На ступеньках, якія вядуць з першага на другі паверх, красуюцца фікусы і пальмы. У прасторных і светлых калідорах расстаўлена мяккая мэбля для абслугоўваючага персанала. Зроблена гэта для таго, каб даглядаючыя не адыходзілі ад хворых у дзяжурку, залішне не былі ў палатах і не парушалі спакою хворых.

Пакой адпачынку для выздараўліваючых абстаўлен мяккай мэбляй, маюцца шашкі, бібліятэчка. Добра абсталёван прэдродавы пакой, дзе роджаніцы знаходзяцца да наступлення родаў.

У душах, ваннах, рукамойніках днём і ноччу неабмежаваная колькасць гарачай вады. Гэта дае магчымасць у любы час рабіць санітарную абработку паступаючых хворых і цяжарных жанчын.

Для ўсяго без выключэння медперсанала ўстаноўлена абавязковае мыццё ў ванне перад пачаткам работы.

Водгукі хворых пра работу аддзялення самыя найлепшыя. Аб гэтым кажуць палатныя кнігі ўражанняў і пажаданняў. Загадчык іх рэгулярна прачытвае і зараз-жа прымае належныя меры. Вось пажадалася групе роджаніц, каб дзяцей не насілі, а вазілі на калясачцы. Калясачка ўжо заказана ў Менску і хутка жаданне матак будзе ажыццяўлёна.

— Кнігі ўражанняў,—кажа, галоўны ўрач **Легенчанка**,—гэта люстра нашай работы. Я за час работы ў Магілёве не меў ніводнай скаргі на дрэнную работу і вельмі гэтым задаволен.

У аддзяленні з 70 асоб медперсанала—55 ударнікаў. Кіраўніцтва больніцы за ўдарную работу 2 разы прэміравала тав. Легенчанка.

За ўвесь час работы аддзяленне не мае ніводнага выпадка сэптычнай смяротнасці альбо сэптычнага захворвання. У першым квартале 1935 года зроблена 40 складаных аперацый. Некаторыя хворыя, раней, чым трапіць у Магілёўскую больніцу, пабывалі ў больш буйных гарадах, дзе іх не згаджаліся аперыраваць і накіроўвалі ў Маскву, а ў Магілёве ім зрабілі аперацыі з вялікім поспехам (Шнэйдзер, Цецерукова).

Колькасць родаў у аддзяленні супроць мінулага году павялічылася амаль удвайне. Так, на 1 мая 1934 г. родаў было 345, а на 1 мая 1935 г.—616. Усяго за першы квартал прапушчана праз больніцу 1490 хворых жанчын.

Вялікая работа праведзена па падрыхтоўцы кадраў. Рэгулярна праводзіцца тэхвучоба. З урачамі і акушоркамі займаецца галоўны доктар Легенчанка, з сёстрамі і санітаркамі—астатнія дактары. У выніку добрай тэхвучобы 4 лепшых санітаркі вылучаны сёстрамі. З 20 акушорак скончылі тэхвучобу і здалі соцтэхэкзамен на „выдатна“ 13 чалавек і на „добра“—8 чалавек.

Сярод выдатнікаў акушорка **Маліноўская** Марыя, маючая 35 гадовы акушорскі стаж. Лепшыя ўдарніцы на рабоце, а зараз выдатніцы на вучобе, маючыя стаж ад 10 да 20 г., т.т. **Альтшулер, Бекарэвіч, Галоўская, Баланцэвіч, Клемперт, Рэўзіна, Вол** і іншыя.

Акушорска-гінекалагічнае аддзяленне больніцы служыць базай і аддзелам медтэхнікума, дзе сотні студэнтаў набываюць тэарэтычныя і практычныя веды.

Гурэвіч, Алексеева.



У радзільным аддзяленні Магілеўскай больніцы.

ШКОДНАСЦЬ АБОРТАЎ

Аборт—штучнае прарыванне цяжарнасці.

Мэта майго артыкула—разглядзець вынікі аборта, з якімі нам так часта прыходзіцца сустракацца, і зрабіць з гэтага адпаведныя вывады.

Аборт робіцца часцей усяго ў першыя два месяцы цяжарнасці, рэдка на трэцім месяцы.

Вынікі аборта двойчыя: непасрэдна пасля аборта і далейшыя.

У часе ўтварэння аборта нават самы вопытны ўрач можа зрабіць прабадзенне маткі. Таму што аборт робіцца навошчуп—у слепую. Матка ў часе цяжарнасці такая мяккая, што інструментам, якім ўрач робіць аборт, лёгка праткнуць матку, прабадаць яе. З прабаданай такім чынам маткі атрымоўваецца крывацячэнне ў брушную поласць. Калі ўрачом заўважана гэта прабадзенне, то хворую можна выратаваць тэрміновай аперацыяй: ускрыць жывот і зашыць шчыліну.

Калі-ж урач гэта не заўважыць і працягвае аперацыю, ён можа праз прабадную шчыліну выцягнуць у влагалішча петлі кішак, сальнік, часам параніць і іх. Зразумела, што і тут аборт таксама патрабуе тэрміновай аперацыі.

Калі-ж прабадзенне засталося незаўважаным для ўрача, праз некалькі дзён пасля аборта атрымоўваецца запаленне брушыны і смерць.

Жанчыны не павінны здзіўляцца, калі на запытанне: „ці добра пройдзе ў мяне аборт?"—яны, чуюць адказ доктара: „аборт—аперацыя ўцёмную ручацца за добрыя вынікі ніколі нельга".

У часе ўтварэння аборта можа быць матачнае крывацячэнне, калі матка дрэнна скарачваецца ў выніку мінулых абортаў.

У першыя дні пасля аборта, які прайшоў добра, жанчына яшчэ не застрахавана ад ускладненняў. Крывацячэнне ад застаўшыхся кавалкаў пладовага яечка, запаленне маткі, труб, яечнікаў, тазавай брушыны, каля матачнай клетчаткі часта суправаджаюцца высокай тэмпературай і надоўга прыкоўваюць хворую да ложка. Вельмі незначная частка гэтай хваробы праходзіць бясследна для жанчын. У большасці выпадкаў рэшткі ад запалення выклікаюць у далейшым болі, няправільныя месячныя, **бясплоднасць** і рад другіх хвароб. А колькі мы ведаем сямейных трагедый з-за адсутнасці дзяцей. Брак без дзяцей—непоўнацэнны.

Трэба адзначыць, што іншы раз аборт праходзіць добра, ускладненняў як быццам няма, а праз некаторы час атрымоўваюцца натуральныя выкідышы адзін за другім, або наступае **бясплоднасць**.

Бясплоднасць і натуральныя выкідышы часцей усяго наглядаюцца пасля прарывання **першай** цяжарнасці. А ўнематачная цяжарнасць, якая нясе ў сябе смяротную небяспеку для жанчын? Хіба не аборт у большасці выпадкаў з'яўляецца яе прычынай?

Прывяду два яркіх прыклада з маей практычнай работы. Хворай В.—29 год. Першая цяжарнасць 10 год таму назад прарвалася штучным абортам, пасля якога на працягу двух месяцаў яна цяжка хварэла запаленнем маткі, матачных труб і яечнікаў. В. лечыцца да гэтага часу, бо хоча мець дзіця Два гады таму назад ёй была зроблена аперацыя ўнематачнай цяжарнасці.

Другой хворай 20 год. Раджала адзін раз два з паловай гады таму назад. Роды прайшлі нармальна. Поўгода таму назад гэта жанчына зрабіла сабе аборт і пасля гэтага цяжка хварэла запаленнем тазавай брушыны і нарывам каляпочачнай клетчаткі на працягу чатырох месяцаў. Хворая доўга змагалася са смерцю. З бальніцы яна выпісалася з рэшткамі запалення палавых органаў, ад якіх доўгія месяцы, а можа і гады прыдзецца ёй лячыцца.

Нідзе, ні ў аднэй краіне зямнога шара няма такіх клопатаў аб жанчыне—мацеры і дзіцяці, як у нашым Совецкім Саюзе. Ільготы ў часе цяжарнасці, вызваленне ад работы на 1—2 месяцы да радоў і пасля іх, магчымасць аддаць дзіця ў яслі, у дзіцячы сад і школу—усё гэта стварае самыя спрыяючыя ўмовы для жанчыны—мацеры ў нас.

Шпаркі рост нашага матэрыяльнага добрабыту яшчэ больш узмацняе ўсе гэтыя магчымасці.

Нашы жанчыны, моцныя фізічна, бадзёрыя духам, не павінны сябе калечыць, шкодзіць свайму здароўю абортамі. Жанчына нашага Саюза павінна даць прыгожае, здаровае пакаленне нашай выдатнай соцыялістычнай радзіме.

Д-р. М. Б. Майзель.

Цана асобнага нумара 20 кап.

ПА СЛЯДАХ РАБСЕЛЬКОРАЎСКІХ ПІСЕМ

Рэдакцыя атрымала пісьмо ад работніцы, у якім яна выкрывала антыпартыйныя паводзіны члена партыі **Падольскай**—работніцы Менскай швейнай фабрыкі „Окцябр". Гэта-ж Падольская была і рабкоркай нашага журнала.

Падольская — дачка буйнага буржуя, скрыла сваё соцыяльнае паходжанне, мае сувязь з класава-варожым элементам, за што яна ўжо выключалася з партыі пры чыстцы 1933 года. Зараз Падольская працягвае сувязь з класава-варожым элементам.

Партыйная арган ыя фабрыкі „Окцябр", куды было накіравана пісьмо, прызнала факты сапраўднымі. За сувязь з чуждымі элементамі Падольская выключана з радоў партыі.

Рэдакцыя журнала выключыла Падольскую з радоў рабкорак.

***

Калгасніца Чырвона-Слабодскага раёна **Буцько** Ганна напісала ў рэдакцыю, што два гады таму назад нарсуд пастанавіў спагнаць аліменты з яе мужа Парфіновіча Івана на ўтрыманне іх дзіцяці, але пастанова гэта не выконваецца. Выканаўчы ліст, які быў накіраваны ў калгас, дзе працуе Парфіновіч, згублен.

Рэдакцыя накіравала гэта пісьмо пракурору Чырвона-Слабодскага раёна. Нядаўна мы атрымалі другое пісьмо ад тав. Буцько, у якім яна піша: „Шчыра дзякую вам, што вы дапамаглі. Цяпер я акуратна атрымоўваю аліменты ад майго былога мужа на ўтрыманне дзіцяці".

***

У сваім пісьме ў рэдакцыю тав. **Рулёва**—калгасніца Уваравіцкага раёна—прасіла наша садзейнічанне, каб змясціць свайго брата—інваліда ў дом інвалідаў, бо догляд за ім перашкаджае ёй у рабоце.

Народны Камісарыят Соцыяльнага забеспячэння, куды звярнулася рэдакцыя, паведамляе, што брат тав. Рулёвай накіраван у Дуянаўскі дом інвалідаў.

***

Падпішчык тав. **Булыга В.**, Талочынскага раёна скардзіўся на нерэгулярную дастаўку нашага журнала. Скарга тав. Булыгі была накіравана ў Беларускае аддзяленне Саюздруку для прыняцця тэрміновых мер у своечасовай дастаўцы.

Нядаўна рэдакцыя атрымала пісьмо ад тав. Булыгі, у якім ён піша, што цяпер нармальна атрымоўвае журнал.

***

У №15 нашага журнала пад загалоўкам: „Ці адпачынак гэта?" пісалася, што адміністрацыя дома адпачынку ў Чонках бяздушна аднеслася да запатрабаванняў адпачываючых работніц з Віцебскай фабрыкі „Сцяг Індустрыялізацыі".

Бюро соцыяльнага страхавання ЦСПСБ паведаміла, што ў Чонкаўскі дом адпачынку быў накіраваны работнік для ліквідацыі на месцы ўсіх недахопаў. Паслана дадатковая колькасць ложак, падушак і пасцельных прылад. Факт невыдачы прадуктаў на дарогу ад'язджаючым—адпавядае сапраўднасці. За гэта дырэктару тав. **Фінкельштэйну** абвешчана вымова.

Работніцы, жонкі рабочых, калгасніцы, працоўныя аднаасобніцы!

ЧЫТАЙЦЕ І РАСПАЎСЮДЖВАЙЦЕ СВОЙ ЖУРНАЛ

„Работніца і калгасніца Беларусі"

ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б

ЖУРНАЛ ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ Ў МЕСЯЦ

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На 12 месяцаў . 4 руб. 80 кап.	На 3 месяцы . 1 руб. 20 кап.
„ 6 „ . 2 „ 40 „	„ 1 „ . — „ 40 „

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях і ў лістаносцаў

У ГЭТЫМ НУМАРЫ ПАДПІСЧЫКАМ ДАСЫЛАЕЦЦА БЕСПЛАТНА УКЛАДКА-ВЫКРАЙКА

Выданне ЦК КП(б)Б — Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Менск, Ленінская 12, клуб друкароў, 2-гі паверх. Тэл. 22-415.

Друкарня ім. Сталіна. Закав № 808. Тыраж 10.000. Ум. Галоўлітбела № 2920.

Здана ў набор 1-IX—35 г. Падпісана да друку 13-IX—35 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.